Яноўскі, А. А. «БДУ будзе аддаваць усе свае сілы для вывучэння Беларусі…» / А. А. Яноўскі // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в.: материалы междунар. науч.-практ. конф. / редкол. : Т. А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. — Минск: БГУ, 2011. — С. 223 – 228

**А. А. ЯНОЎСКІ**

# «БДУ БУДЗЕ АДДАВАЦЬ УСЕ СВАЕ СІЛЫ ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСІ...»

У назву дадзенай публікацыі вынесены словы рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта У. І. Пічэты, якія ён выказваў не аднойчы, падкрэсліваючы высакародную місію першай вышэйшай навучальнай установы савецкай Беларусі.



Літаральна з самага пачатку дзейнасці БДУ ў сферу навуковых інтрэсаў яго грамадазнаўцаў арганічнай састаўляючай увайшлі праблемы, датычныя менавіта разнастайнай беларускай праблематыкі. Работы быў непачаты край: амаль нераспрацаваная гісторыя ва ўсіх яе храналагічных і тэматычных накірунках, сістэматызацыя і асэнсаванне моўных і літаратурных здабыткаў, неабходнасць навуковага вывучэння арэалаў пражывання беларусаў (з улікам, зразумела, тагачасных палітычных абставін, якія то звужалі, то «ўзбуйнялі» прасторы беларусчыны), правядзенне этнаграфічных доследаў, краязнаўчае пасціжэнне патаемных асаблівасцей былых ці то «усходніх крэсаў», ці то імперскай «акраіны».

Таму натуральным стала распачынанне ўжо ў 1921 г. дзейнасці двух навуковых таварыстваў, у эпіцэнтры ўвагі якіх былі пакладзены перш за ўсё падобныя пытанні. Знайсці адказы на іх, як вынікае з аднаго з палажэнняў статута Навуковага Таварыства БДУ, магчыма было толькі пры «... аб’яднанні духоўных сіл Мінска». Калі ж у цэлым пазначыць накірункі дзейнасці Навуковага Таварыства БДУ і Мінскага Таварыства гісторыі і стражытнасцей, то відавочна іх імкненне да захавання гістарычнай памяці беларусаў праз дэталёвае вывучэнне ўсіх абставін (гістарычных, прыродна-кліматычных, пабытовых, ментальных і г. д.) жыцця. Якраз праз гэта мецілася пашырыць шлях да ўзмацнення сацыяльнай кансалідацыі ва ўмовах рэвалюцыйных ператрусаў, асэнсавання сваёй нацыянальнай ідэнтыфікацыі, выявіць шляхі рашэння сацыяльна-палітычных і эканамічных праблем.

Выкладчыкі БДУ былі пранікнуты імкненнем не толькі да паглыбленай распрацоўкі «беларусазнаўчых» пытанняў, але і намагаліся выкарыстоўваць вынікі сваіх доследаў у практыцы выкладання. Таму напрацоўкі непасрэдна ўводзіліся ў навучальны працэс, выкарыстоўваліся як сродак выхавання адметных рыс характару, грамадскіх і прафесіянальных якасцяў студэнтаў як будучых, зразумела, – савецкіх спецыялістаў. З пачатку 20-х гг. вучоныя БДУ вызначалі накірункі і сэнс сваіх навуковых даследаванняў такім чынам, каб іх вынікі непасрэдна маглі спрыяць беларускаму нацыянальнаму адраджэнню. «Беларускі кампанент» у розных яго праявах быў амаль абавязковым для навуковых прац як гуманітарыяў, так і прыродазнаўцаў.

У справе «навуковага выхавання» маладога пакалення беларускай інтэлігенцыі вялікую ролю адыгралі «старыя», дарэвалюцыйнага гарту, спецыялісты. Яны заклалі падмуркі навуковых школ. Так, У. І. Пічэта на 16-м пасяджэнні Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасцей зрабіў даклад «Чарговыя пытанні беларусазнаўства», а ў хуткім часе дыскутаваў па дакладу Дземідовіча «Беларускае вяселле», прапанаваўшы калегам натхніць студэнтаў да збору беларускіх этнаграфічных матэрыялаў [1; 2]. А праз год рэктар-гісторык падрыхтаваў даклад на вызначальную тэму: «Беларуская мова як фактар нацыянальна-культурны» [3]. Такія прыклады можна множыць і множыць. Так, нельга не адзначыць, што аднымі з самых актыўных стваральнікаў першага музея БДУ былі расіязнаўцы Уладзімір Пічэта, Аляксандр Савіч і Дзмітрый Жарынаў [4, л. 3, 16]. Іх і іх калег карпатлівая праца дазволіла ў кароткі час стварыць якасны па ўсіх параметрах збор універсітэцкай бібліятэкі, арганізаваць шэраг вучэбных кабінетаў, калекцыі якіх прырошчваліся «з калёс» па выніках этнаграфічных, краязнаўчых,



лінгвістычных і іншых экспедыцый выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта, натхніла правесці некалькі Ўсебеларускіх навуковых канферэнцый, арганізаваць рэгулярныя цыклы публічных лекцый па нацыянальнай тэматыцы перад рознымі аўдыторыямі і г. д.

Той жа Аляксандр Антонавіч Савіч, не вельмі трымаючыся «актыўнай жыццёвай пазіцыі», тым не менш не аднойчы адстойваў інтарэсы беларусаў у розных палітычных калізіях пачатку 20-х гадоў. Так, ён 18 сакавіка 1922 г. разам са сваімі калегамі па Савету БДУ кіраваўся інтарэсамі Беларусі пры абмеркаванні пытання аб запатрабаванні да Польшчы вярнуць культурныя каштоўнасці, якія маюць «ближайшее отношение к истории и культуре белорусского и других народов» [5, с. 127– 128]. А 30 красавіка 1923 г. гісторык-беларус расійскай вывучкі разам з У. І. Пічэтай, С. Я. Вальфсонам і І. Ю. Марконам выказаў пратэст

з нагоды «бясчынстваў польскіх улад над нацыянальнымі меншасцямі ў вобласці адукацыі ў Заходняй Беларусі» [6]. Колькі разоў ён дакладваў вынікі сваіх навуковых доследаў па праблемах развіцця адукацыі і культуры на беларускіх землях у XVI–XVII стст., друкаваўся на старонках першых выпускаў «Прац БДУ» [7, с. 273; 8; 9].

Увогуле, сімвалічна тое, што такая накіраванасць дзейнасці выкладчыкаў універсітэта была зафіксавана амаль што афіцыйна – у штогадовых справаздачах БДУ ў самыя высокія ўрадавыя інстанцыі і нават у Маскву мелася рубрыка «Нацыянальна-культурны накірунак і краязнаўства». І заўсёды называліся тыя выкладчыкі, якія належылі да гэтага накірунка [10, л. 9]. Такім чынам, кіраўніцтва і калектыў універсітэта, як і планавалася, важнейшым аспектам усёй грамадскай дзейнасці і прызначэння БДУ разумелі «шматбаковую працу па вывучэнню Беларусі» [11, с. 71].

Яскрава сэнс і накірункі навуковых намаганняў універсітэцкіх выкладчыкаў адлюстроўваюць тагачасныя вучэбныя планы. Яны былі складзеныя не толькі для таго, каб весці падрыхтоўку спецыялістаў па пэўных накірунках ведаў і прафесійных навыкаў, але і дзеля іх выхавання як беларускіх інтэлігентаў. Аб гэтым пісаў член першага Праўлення БДУ Фёдар Турук: «Программа этнолого-лингвистического отделения <...> построена применительно к местным этнографическим особенностям края <...>. В программу общественно-педагогического отделения <...> включено несколько курсов, имеющих исключительно местное значение и ставящих своей задачей познакомить общественного работника с той местной историко-культурной обстановкой, в которой последнему приходится работать» [12, с. 196]. Так, вучэбны план секцыі беларускай мовы таго ж этнолага-лінгвістычнага аддзялення факультэта грамадскіх навук, які хоць і знаходзіўся пад асабліва пільным кантролем з Масквы, амаль палову асноўных курсаў прафесійнай падрыхтоўкі (9 з 22) адводзіў вывучэнню прадметаў беларускай арыентаванасці. Імі была насычана і падрыхтоўка студэнтаў іншых аддзяленняў гэтага факультэта. Больш за тое, як адзначае той жа Ф. Турук, у «схему БДУ» і яго статут планавалася ўвесці асобны навукова-даследчы інстытут па вывучэнню беларусістыкі [12, с. 199].

Калі паспрабаваць вызначыць нейкую завершаную канструкцыю ў дачыненні да беларускай праблематыкі, то яе проста не было. Цікавасць існавала да ўсяго, што хоць нейкім чынам згадвалася з Беларуссю і беларусамі, з іх «культурна- сацыяльным адраджэннем», як можна сустрэць падобную дыфеніцыю ў



публікацыях 20-х гг. [13]. І тым не менш праглядаецца пэўны ланцужок навуковых інтарэсаў і інтуітыўна-канцэптуальных падыходаў і навукоўцаў, і шырокіх колаў грамадства ў пастаноўцы пытанняў і іх сістэматызацыі ў асэнсаваным зададзеным накірунку. Так, ужо з 1917 г. актыўна стала развівацца «беларусазнаўства», якое набыло ў сценах БДУ дакладныя рысы праз гісторыю Беларусі і розныя варыянты яе «гісторыі права і гаспадаркі», праз беларускія ж па прадмету даследавання і вывучэння этнаграфію, археалогію, археаграфію, мастацтвазнаўства, філалогію, педагогіку. І ва ўніверсітэце, і на мясцовых узроўнях у больш агульным разуменні яно нярэдка ўспрымалася як «радзімазнаўства» [13, с. 163]. Таму, напрыклад, побач з існаваннем «кафедры» этнаграфіі Беларусі (яе на 1923 г. увасабляў Аляксандр Шлюбскі) у асобе Ісаака Сербава дзейнічала «кафедра» этнаграфіі Расіі і Беларусі [14, л. 65]. Такім жа прынцыпам кіраваліся і пры вызначэнні некаторых іншых вучэбных дысцыплін і адпаведных ім «кафедраў» (гісторыі права і гаспадаркі «проста» Беларусі і – сумесна Расіі і Беларусі).

У гэтым магчыма назіраць як палітычны аспект, так і відавочную праяву выхавання, прафесійнай падрыхтоўкі і агульнага менталітэту першага пакалення ўніверсітэцкіх гуманітарыяў. Цяжка прадставіць сабе, што маскоўскія, пецярбургскія, кіеўскія і іншыя прафесары маглі быць пранікнёнымі праваднікамі беларускай ідэі. Успрыняцце Беларусі як радзімы для саміх беларусаў было яшчэ дастаткова цьмяным, нейкім «местачковым» (і гэта ўзмацнялася праходзіўшымі «узбуйненнямі», якія штораз змянялі межы радзімы). Расійская ж па паходжанню ўніверсітэцкая інтэлігенцыя тым больш не магла хутка засвоіць Беларусь у яе дакладнай тэрытарыяльнай, этнічнай, культурнай і г. д. дадзенасці. Расія з яе дамінуючымі пачаткамі ў гістарычным мінулым і рэвалюцыйным сёння – вось што толькі магло, па іх меркаванню, пазначацца падобным высакародным словам.

І натуральна, што кампрамісным аб’яднальным дачыненнем да ўсяго спектра навуковых, педагагічных, грамадскіх і іншых праблем стала праз пэўны кароткі час (і, нажаль, на кароткі час) «краязнаўства». Праз такую форму-накірунак, якая сама па сабе складвалася не вельмі проста, стала магчымым аб’яднаць усіх, хто меў намер прафесійна ці па-дылетанцкі распрацоўваць беларускую праблематыку ў розных яе праявах. У краязнаўстве таго часу гарманічна зліваліся ў адзіную плынь навука і грамадскі настрой, у працяг ранейшым здабыткам і традыцыям назапашвалася багатая база дадзеных аб Беларусі. Аб гэтым сэнсе краязнаўства распавядаў У. І. Пічэта ў красавіку 1924 г. на Усебеларускай канферэнцыі навуковых работнікаў: «Навука распрацоўваецца сумесна на прынцыпах узаемнай добразычлівасці і навуковага супрацоўніцтва <... >, накіраванага на адраджэнне Беларусі» [15; 16].

Краязнаўчы рух ахапіў усіх. БДУ побач з Інбелкультам стаў адным з цэнтраў арганізацыйнай і навуковай яго падтрымкі. Аб дзейнасці ўніверсітэцкіх краязнаўцаў захавалася шмат матэрыялаў, якія можна знайсці ў архівасховішчах, на старонках шматлікіх зборнікаў «даўнін», часопісаў і газет (у тым

ліку адпаведных – краязнаўчых) таго часу. Пэўнае падсумаванне кароткага, але плённага шляху, які быў асілены краязнаўчым рухам, можна знайсці на старонках часопіса «Наш Край» напрыканцы 1920-х гг., бо ўжо потым рух і тыя, хто яго ўвасабляў, былі струшчаны рэпрэсіямі. У 1927 г. некаторыя высновы зрабіў У. І. Пічэта як

226

старшыня ўніверсітэцкага Таварыства. Ён засяродзіў увагу перш за ўсё на разглядзе ўзаемадачынення навучальнага працэсу ў БДУ і краязнаўчага руху [17, с. 26–30]. А адзін з актыўных карэспандэнтаў дадзенага часопіса (як і «Чырвонага Сьцягу»), студэнт БДУ Янка Марук, які быў намеснікам Пічэты ў Праўленні краязнаўчага таварыства БДУ, падаў амаль што цэласны агляд зробленага краязнаўцамі за нейкія там 5–6 гадоў [18, с. 7–14]. Ён пазначыў тры этапы, якія прайшоў у сваім развіцці краязнаўчы рух: ад грамадскай зацікаўленасці ў спазнанні Беларусі і спарадычнага збору «краязнаўчага матэрыялу» – да разгортвання навукова-даследчай апрацоўкі раней сабранага, а затым – да падрыхтоўкі студэнтаў да практычнай работы і арганізацыі разганалінаванага сістэмнага краязнаўчага руху. Трэці этап і азнаменаваў сабой поўнавартаснае дачыненне да вывучэння Беларусі ва ўсіх яе праявах і праблематыцы.

Аб гэтым сведчыла і арганізацыйная структура ўніверсітэцкага Таварыства: у 1927/1928 навучальным годзе 259 яго членаў працавалі ў адпаведнасці з двухгадовым планам навукова-даследчай работы па шасці секцыях (сацыяльна-эканамічнай, медыцынскай, прыродна-геаграфічнай са шматлікімі асобнымі камісіямі, культурна-гістарычнай, мовы і літаратуры, яўрэйскай) [18, с. 10]. Праз краязнаўчы рух праходзіла арганізацыя этнаграфічных і археалагічных экспедыцый, аб’яднанне мясцовых секцый і гурткоў (у тым ліку і кафедральных), сістэматызацыя знаходак і іх навуковае вывучэнне з абавязковай публікацыяй вынікаў, правядзенне курсаў-студый з чытаннем разнастайных адмысловых лекцый-дысцыплін як маладымі энтузіястамі, так і аўтарытэтнымі навукоўцамі (Пічэтай, Гайдуковым, Піатуховічам, Бузуком, Ластоўскім, Ляўданскім, Бібіла і інш.).

Відавочным дасягненнем краязнаўчага руху, у тым ліку і Таварыства БДУ, стала арганізацыя некалькі комплексных экспедыцый, пад час якіх браліся да ўвагі амаль усе больш-менш цікавыя акалічнасці, звязаныя з гісторыяй, прыродай, народным жыццём той ці іншай беларускай мясціны. Так, за 1927–1928 гг. універсітэцкія выкладчыкі і студэнты правялі тры падобныя экспедыцыі – на Ушаччыну, па Свіслачы, у падшэфны Падгайскі сельсавет. Вывучаліся асаблівасці расліннага і жывёльнага свету мясцін, агульны стан экалогіі ў сувязі з жыццядзейнасцю чалавека, рабіліся апісанні мясцовых абрадаў, запісы фальклору, стану эканомікі і г. д. [18, с. 13–14].

Калі паспрабаваць зрабіць пэўнае падсумаванне кароткага агляду форм і накірункаў вывучэння Беларусі ў 1920-я гг., што практыкаваліся ў БДУ, то зноў жа для лапідарнасці можна спаслацца на разважанні Уладзіміра Іванавіча ў яго знакамітым ужо «Мое общественно-политическом credo», якія ён паклаў на паперу пад час турэмнага зняволення. Гісторык так і застаўся перакананым у тым, што такая маштабная навуковая і грамадская дзейнасць, якую спазнаў і ўвасабляў сабой універсітэт у 20-я гады, паставіла «... на прочный фундамент изучение истории, экономики и культуры Белоруссии» [19, л. 22]. І гэта зрабілі людзі ўніверсітэта, у незалежнасці ад паходжання, але імкнучыся дакрануцца да нязведаных навукай і так патрэбных усім беларусам каранёў іх продкаў, акалічнасцей жыццядзейнасці, перспектыў будучнасці.

227

## ЛІТАРАТУРА


1. Савецкая Беларусь. 1922. 27 кастрычніка.
2. Савецкая Беларусь. 1922. 6 снежня.
3. Савецкая Беларусь. 1923. 29 верасня.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). Фонд 205. Воп. 1. Спр. 112.
5. Памяць і слава. Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1921–1941 / склад.: С. М. Ходзін, М. Ф. Шумейка, А. А. Яноўскі. Мінск : БДУ, 2006. – 382 с.
6. Савецкая Беларусь. 1923. 3 мая.
7. *Каценбоген, С. З.* Белорусский Государственный Университет за 1922–1923 академ. год (Итоги и перспективы) / С. З. Каценбоген // Труды Белорусского Государственного Университета. 1923. № 4–5.
8. *Савич, А. А.* Западно-русские униатские школы XVII–XVIII веков / А. А. Савич // Труды Белорусского Государственного Университета в Минске. 1922. № 1.
9. *Савич, А. А.* Западно-русские униатские школы XVII–XVIII веков (Продолжение) / А. А. Савич // Труды Белорусского Государственного Университета в Минске. 1922. № 2–3.
10. НАРБ. Фонд 205. Воп. 1. Спр. 127.
11. *Улащик, Н. Н.* В. И. Пичета в первые годы существования Белорусского государственного университета / Н. Н. Улащик // Славяне в эпоху феодализма. К 100-летию академика В. И. Пичеты. М. : изд-во «Наука», 1978. – 343 с.
12. *Турук, Ф. Ф.* Университетская летопись / Ф. Ф. Турук // Труды Белорусского Государственного Университета в Минске. 1922. №1.

13. Полымя. 1923. № 5–6.
14. НАРБ. Фонд 205. Воп. 1. Спр. 77.
15. Звезда. 1924. 11 апреля.
16. Звезда. 1924. 17 апреля.
17. Наш Край. 1927. № 10.
18. Наш край. 1929. № 1.
19. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. Фонд 147. Воп. 2. Спр. 11.